# Ці варта асцерагацца прадаўцам і ўладальнікам фотаальбома «Прэс-фота»?

17 красавіка Юліі Дарашкевіч патэлефанавалі з «Кніжнага салона» на вул. Калініна з просьбай забраць рэшту накладу фотаальбома, што ў іх прадаваўся.

Пра гэта журналістка паведаміла на сваёй старонцы ў Фэйсбуку.

Сёння раніцай ГА «БАЖ» звязалася з салонам і высветліла, што крама сапраўды не збіраецца больш прадаваць гэтыя кнігі – нягледзячы на тое, што на той момант суд першай інстанцыі яшчэ нават не агучыў свайго рашэння.

На краму ніхто не ціснуў, гэта рашэнне ўласнікаў. «Паколькі пытанне ўзнікла, мы вырашылі, што так будзе лепш, – зазначыла супрацоўніца салона. – У нас прыватнае прадпрыемства, і мы менш абароненыя ад рашэнняў улады».

**Ці апраўданыя такія перасцярогі? Што гаворыць на гэты конт закон і што – практыка?**

Закон РБ «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму» дзейнічае з пачатку 2007 года. Паводле яго арт. 14, судовае рашэнне аб прызнанні інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкімі матэрыяламі з'яўляецца падставай для яе знішчэння, але толькі пасля ўступлення ў законную сілу. Рашэнне можа быць абскарджанае ў адпаведнасці з заканадаўствам. Копія судовага рашэння, якое ўступіла ў законную сілу, накіроўваецца ў Мініфармацыі для ўключэння ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Гэты спіс падлягае апублікаванню ў СМІ. *(Так было ў 2008 годзе з кампакт-дыскамі, забранымі ў А. Буракова на мяжы – гл. малюнак.)*

**Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў**

| Від інфармацыйнай прадукцыі | Назва, аўтар, вытворца інфармацыйнай прадукцыі | Назва суда, які вынес рашэнне, і дата ўступлення ў сілу рашэння суда |
| --- | --- | --- |
| CD-R дыскі | 6 дыскаў з назвай «Урок Беларускае мовы»; 3 дыскі з назвай «Канцэрт Салідарныя зь Беларусьсю на рынкавай Плошчы Новага Горада ў Варшаве 12 сакавіка 2006»; 7 дыскаў з назвай MEGAUS MEG 16753. Канфіскаваныя ў гр-на Буракова Аляксандра Уладзіміравіча | Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Гродна, уступіла ў сілу 16 верасня 2008 года |

*Абвестка ў нумары "Звязды" за 2 кастрычніка 2008 г.*

Паводле Пастановы Савета Міністраў РБ ад 23 красавіка 2007 г. №513, вядзеннем і апублікаваннем рэспубліканскага спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў займаецца Мініфармацыі. У той жа дзень, калі з суда паступае копія рашэння, міністэрства павінна ўключыць яго ў спіс і цягам трох дзён перадаць для публікацыі ў газеты **"Рэспубліка"**, **"Народная газета"** і **"Звязда"**. Тыя, у сваю чаргу, мусяць апублікаваць спіс цягам трох дзён пасля паступлення з Мініфармацыі.

Арт. 17.11 КаАП прадугледжвае адказнасць за "выраб і (альбо) распаўсюд, а роўна захоўванне з мэтай распаўсюду экстрэмісцкіх матэрыялаў, калі ў гэтых дзеяннях няма складу злачынства". Для прыватных асобаў – штраф ад 10 да 50 базавых велічыняў альбо адміністратыўны арышт, для індывідуальнага прадпрымальніка – штраф ад 50 да 100 базавых велічыняў, для юрыдычнай асобы – штраф ад 100 да 500 базавых велічыняў (ва ўсіх выпадках – з канфіскацыяй "прадмета адміністратыўнага правапарушэння", а таксама "прыладаў і сродкаў здзяйснення ўказанага правапарушэння").

Як вядома, суд Ашмянскага раёна 18 верасня прызнаў фотаальбомы "Прэс-фота Беларусі 2011" "экстрэмісцкімі матэрыяламі".

«Зараз ёсць магчымасць абскардзіць гэтае рашэнне ў касацыйнай інстанцыі цягам 10-і дзён. У выпадку з альбомамі “Прэс-фота” гэта Гродзенскі абласны суд, – тлумачыць намеснік старшыні ГА “БАЖ” **Андрэй Бастунец**. – Тобок, тыя асобнікі альбома, якія знаходзяцца ў КДБ, могуць быць знішчаныя толькі калі ніхто не абскардзіць рашэння суда першай інстанцыі, ці калі Гродзенскі аблсуд яго пацвердзіць. Далейшае абскарджанне ў парадку нагляду (на імя старшыні Гродзенскага аблсуда, у Вярхоўны суд) магчымае, але на лёс забраных асобнікаў альбома гэта не абавязкова паўплывае. Наглядная інстанцыя можа прыпыніць выкананне судовага рашэння, а можа гэтага і не зрабіць.

Распаўсюднікі кнігі могуць рабіць сваю справу аж да ўступлення судовага рашэння ў законную сілу. Толькі пасля гэтага распаўсюд можа лічыцца адміністратыўным правапарушэннем.

**БАЖ:** Ці варта нервавацца тым, хто проста набыў альбом і мае яго на паліцы дома ці ў офісе?

**А. Бастунец:** Звычайныя ўладальнікі альбома могуць не апасацца ў любым выпадку – захоўванне альбома не цягне за сабой адміністратыўнай адказнасці, калі яно не мае на мэце распаўсюду.

**БАЖ:** А што з фатографамі і арганізатарамі конкурса?

**А. Бастунец:** У судовым працэсе разглядалася пытанне не пра прыцягненне да адказнасці пэўных асобаў, а пра прызнанне прадукцыі “экстрэмісцкімі матэрыяламі”. У матэрыялах, дарэчы, ёсць рашэнне аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы ў сувязі з адсутнасцю складу злачынства. Такім чынам, арганізатарам конкурса і фатографам нічога пагражаць не павінна.